фесійнай дзейнасці і прафесійнай культуры спецыяліста. Высокая прафесійная падрыхтоўка і авалоданне прафесійным майстэрствам не могуць быць дасягнуты без усведамлення студэнтам свайго «Я» ў прафесійнай дзейнасці. Таму стварэнне адпаведных модуляў у вучэбным працэсе, накіраваных на фарміраванне прафесіянальнай самасвядомасці, будзе пазітыўна ўплываць на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў сферы культуры і мастацтва.

---

1. *Психологический* словарь / Под ред. В.В.Давыдова, А.В.Запорожца, Б.Ф.Ломова и др. – М.: Педагогика, 1983. – С.332.

2. *Маркова А.К.* Психология профессионализма. – М.: Педагогика, 1996 . – С.93.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Н.У.Самерсава,** *дацэнт*

## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК СРОДАК І ЎМОВА ЭКАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Адной з характарыстык сацыякультурнага асяроддзя з'яўляецца яго экалагічны аспект. Рэальная экалагічная небяспека, што ўзнікла ў сувязі з парушэннем чалавекам асноўных законаў суіснавання з прыродай, ставіць перад чалавецтвам прынцыпова новыя задачы, звязаныя з асэнсаваннем праблем аховы і абароны навакольнага асяроддзя. Зберагчы прыроду – значыць захаваць асноўныя ўмовы жыцця чалавека. Таму экалагічны аспект сацыякультурнай дзейнасці мае на сённяшні дзень прыярытэтную значнасць.

Культуролагі, педагогі і псіхолагі ва ўсе часы высока ацэньвалі ролю прыроды ў фарміраванні асобы чалавека, сцвярджалі той факт, што яго духоўнае жыццё непарыўна звязана з прыродай. У класічнай педагогіцы маюць абгрунтаванне ідэі значнасці

зносін дзіцяці з прыродай, яго адукацыі і выхавання з мэтай фарміравання яго светапогляду.

Ролю прыроды ў маральна-этычным развіцці чалавека раскрывалі вялікія гуманісты А.Гумбальт, Ф.Дыстэрвег, Г.Песталоцці, Ж.-Ж.Русо, якія адзначалі спрыяльны ўплыў на выхаванне дзіцяці прыроды.

Супраць бяздушных адносін да прыроды, яе фармальнага вывучэння, вузкага практыцызму выступалі рускія асветнікі В.Р.Бялінскі, А.І.Герцэн, М.А.Дабралюбаў, Д.І.Пісараў, К.Д.Ушынскі, М.Г.Чарнышэўскі.

Аднак доўгі час экалагічная адукацыя і выхаванне як важныя напрамкі педагагічнай навукі і сацыякультурнай дзейнасці наогул не разглядаліся. У сярэдзіне 90-х гг. XX ст. пад уплывам аб'ектыўных фактараў разгарнуліся дыскусіі аб стратэгіі айчыннай экалагічнай адукацыі і выхавання, фарміраванні экалагічнай культуры насельніцтва. Узнікла неабходнасць праектавання мадэлі інтэграванай адукацыйнай сістэмы новага тыпу, якая ўяўляе сабой канструктыўнае аб'яднанне элементаў педагагічных і сацыякультурных тэхналогій.

Распрацоўка мадэлі экалагічнай адукацыі і выхавання ва ўмовах сацыякультурнай установы дазваляе стварыць такое адукацыйнае асяроддзе, якое будзе камфортным для ўсіх удзельнікаў эколага-адукацыйнага працэсу.

Экалагічная адукацыя ва ўмовах сацыякультурнай сферы – гэта цэласны і бесперапынны працэс, які цесна звязаны з прыродай і праходзіць паэтапна. Выкарыстанне разнастайных формаў і метадаў сацыякультурнай дзейнасці дазваляе вучням вызначыць напрамак і тэмпы праходжання «індывідуальнага адукацыйнага маршруту» [2].

У пазакласнай і пазашкольнай рабоце, у разнастайных клубных аб'яднаннях, студыях, грамадскіх арганізацыях у ўдзельнікаў развіваюцца пазнавальная актыўнасць, любоў і цікавасць да прыроды, эколага арыентаванай працы, навуковых даследаванняў. Адукацыйны працэс арганічна ўпісваецца ў «клубную прастору»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і складае з ёй адзінае адукацыйнае поле, у якім асноўную ролю выконваюць наступныя прынцыпы:

– стварэнне спрыяльных умоў, якія забяспечваюць адзінства адукацыі, развіцця і аздараўлення;

– фарміраванне інтэгратыўнага, цэласнага ўспрымання і асэнсавання навакольнага асяроддзя;

– свабода ў выбары падыходаў, метадаў, сродкаў і формаў у арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці;

– індывідуалізацыя і дыферэнцыяцыя вучэбна-выхаваўчага працэсу.

У рамках такой сістэмы вучань з'яўляецца актыўным суб'ектам пазнання навакольнага свету. Ён мае свабоду выбару зместу і тэмпаў асабістай экалагічнай адукацыі. Сацыяльны педагог у межах такой сістэмы выступае як арганізатар дзейнасці навучэнцаў. Метады навучання накіраваны на тое, каб прапанаваная сацыяльным педагогам праграма стала праграмай самога дзіцяці. Інтэнсіўны характар адукацыйнага працэсу арыентаваны на візуалізацыю мыслення вучняў, свабоду ў вызначэнні асабістага светапогляду. Такі змест адукацыі запатрабаваны духоўнай прыродай дзіцяці, яго імкненнем пазнаць самога сябе і навакольнае асяроддзе.

Клубныя праграмы ў адрозненне ад агульнашкольных больш уражваюць, садзейнічаюць ужыўленню дзіцяці ў навакольнае асяроддзе [1].

Гэтыя праграмы ўмоўна уключаюць тры ступені.

На першай адбываюцца развіццё сенсорыкі, фарміраванне эмацыянальна-пачуццёвых адносін да прыроды. Успрыманне свету ідзе ва ўмовах арганізацыі розных відаў гульнёвай дзейнасці, што ўзбагачае жыццёвы вопыт вучня, стварае глебу, якая спрыяе яго творчаму развіццю.

На другой ступені працягваецца развіццё эмацыянальнай сферы, а таксама пачынаецца засваенне іншых спосабаў пазнання. Адукацыйны працэс будуецца на выкананні творчых заданняў, самастойных работ, якія спрыяюць развіццю лагічнага мыс-

лення, фантазіі, уяўлення. Гэта перыяд узнікнення ў свядомасці дзіцяці ўстойлівых сувязей сістэмы «я – прырода».

Трэцяя ступень прадугледжвае авалоданне метадамі атрымання канкрэтных фактаў, фармулёўкі праблемы і гіпотэзы, пабудовы асабістага тлумачэння.

Вялікую ролю ў стымуляванні творчай актыўнасці вучняў адыгрываюць ролевыя экалагічныя гульні, якія аказваюць дапамогу ў развіцці творчага ўспрымання сусвету і ў асэнсаванні сябе ў ім, актывізуюць самастойны пошук вырашэння ўзніклых праблем.

Спецыфічныя асаблівасці сацыякультурнай дзейнасці такія, што на кожнай ступені перад вучнямі адкрываецца магчымасць выбару разнастайных па змесце і формах відаў дзейнасці. Пасля засваення вызначанага ўзроўню базавых ведаў вучань мае магчымасць выбраць свой індывідуальны парадак працы.

Эколага-адукацыйныя праграмы ў пазашкольнай і пазакласнай рабоце дапаўняюць асноўную адукацыю. Спецыфіка дапаўняльнай адукацыі дазваляе пры гэтым выкарыстоўваць нетрадыцыйныя формы і метады, што, безумоўна, дае вялікі якасны вынік.

Трэба адзначыць, што сацыякультурная дзейнасць у экалагічным напрамку – гэта цікавая і спецыфічная работа, звязаная з разнастайнымі бакамі чалавечага вопыту. Яна садзейнічае развіццю свядомасці, інтуіцыі, сістэмнага мыслення. Дапамогу ў гэтым аказваюць такія формы работы, як экалагічныя святы, сюжэтна-ролевыя і дзелавыя гульні, інфармацыйна-дыскусійныя праграмы, экатэатр і экадыскатэкі, завочныя экалагічныя вандроўкі, конкурсы і віктарыны, цыклы сустрэч з вучонымі, паэтамі і пісьменнікамі, казкі, песні, вершы і загадкі, відэа- і кінаматэрыялы і інш.

Умелае, прафесійнае карыстанне разнастайнымі формамі і метадамі сацыякультурнай дзейнасці ў поўнай меры садзейнічае аптымізацыі працэсу экалагічнай адукацыі і выхавання, фарміраванню экалагічнай свядомасці і экалагічнай культуры насельніцтва.

1. *Аксютик Н.И.* Клуб в системе экологического воспитания: Дис. ...канд. пед. наук: 13.00.05.– Л., 1985. – 182 с.

2. *Корякина Н.И., Сабуров Л.Р.* Экологическое образование в условиях клубной работы // Экопедагогика: состояние, проблемы, перспективы: Тез. докл. науч. конф. – Мн., 1994. – 199 с.

3. *Краткий* психологический словарь / Под ред. А.В. Петровского, М.Г. Ярошевского. – Ростов-на-Дону, 1998.

**И.Л.Смаргович**, *преподаватель*

## СУТЬ И ЗНАЧЕНИЕ МАССОВЫХ ФОРМ ОРГАНИЗАЦИИ СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Изменения в социальной и политической жизни страны привели к преобразованию предмета «Культурно-просветительная работа», изучаемого в вузах культуры, в дисциплину «Массовые формы организации социокультурной деятельности». Развитие и трансформация общества логически расширяют понимание данного предмета, углубляют его значение. На современном этапе мы выходим на технологии организации больших акций социально-культурного, общественно-политического значения и приближаемся к наиболее полному пониманию этого предмета.

В настоящее время происходит переосмысление популярных и широко распространенных массовых форм организации социокультурной деятельности, таких как фестивали, конкурсы, концерты, спортивно-зрелищные мероприятия, праздники народного творчества, вечера отдыха, шоу-программы, театрализованные представления, литературно-художественные праздники, ярмарки. Эмоциональной основой любой массовой формы организации социокультурной деятельности является праздник. Само понятие праздника имеет глубокие социальные корни и смысл. Праздники формируются в обществе для производства, распределения, об-